ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 37 (870) ● ЧАЦВЕР, 21 снежня 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXVI

**ЗА ПОСПЕХІ, ДАСЯГНУТЫЯ Ў РЭСПУБЛІКАНСКІМ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ Ў ГОНАР 50-ГОДДЗЯ ЎТВАРЭННЯ САЮЗА ССР НАШ УНІВЕРСІТЭТ УЗНАГАРОДЖАН ЮБІЛЕЙНАЙ ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ЦК КП БЕЛАРУСІ, ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР, САВЕТА МІНІСТРАЎ БССР І БЕЛСАЎПРОФА.**

# З УЗНАГАРОДАЙ!

Актавая зала галоўнага корпуса прыняла ўжо сотні людзей, але ўсё падыходзяць і падыходзяць студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі. Паклікала іх сюды радасная вестка аб тым, што калектыў універсітэта за поспехі, дасягнутыя ў рэспубліканскім сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 50-годдзя ўтварэння Саюза ССР, узнагароджан Юбілейнай ганаровай граматай ЦК КП Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа.

Мітынг адкрывае сакратар парткома Т. Я. Дударава. Яна прадастаўляе слова рэктару БДУ члену-карэспандэнту АН БССР У. М. Сікорскаму.

— Прыемна і радасна ўсведамляць, што наш калектыў зберагае добрыя традыцыі, — гаворыць Усевалад Міхайлавіч. — Аб гэтым сведчыць той факт, што ў ліку пераможцаў перадюбілейнага спаборніцтва — наш універсітэт. Радуючыся гэтай падзеі, мы, натуральна, першыя словы падзякі звяртаем да Цэнтральнага Камітэта Кампартыі і ўрада рэспублікі за высокую адзнаку намаганняў нашага калектыву.

У. М. Сікорскі гаворыць аб той вялікай працы партыйных, камсамольскіх, грамадскіх арганізацый універсітэта, кожнага члена калектыву, якая прывяла да перамогі ў юбілейным спаборніцтве. Гэта і адкрыццё двух новых факультэтаў прыкладной матэматыкі, стварэнне новых кафедр, аснашчэнне лабараторый сучасным абсталяваннем, плённыя намаганні па развіццю навукі і лепшай падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў, гэта і больш цесныя сувязі з вытворчасцю, і шырокая агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць універсітэцкай арміі лектараў, членаў таварыства «Веды», і шмат іншых дасягненняў у рознабаковай дзейнасці нашай вну.

У заключэнне У. М. Сікорскі заклікаў студэнтаў і ўвесь калектыў БДУ дабіцца новых поспехаў у трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі, прадумаць свае планы і абавязацельствы і шырока разгарнуць спаборніцтва за далейшае развіццё навукі і ўдасканаленне падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў.

І як працяг расказа, насычанага цікавымі фактамі аб нашым жыцці ў юбілейным годзе, прагучалі выступленні кіраўнікоў калектываў, стаўшых пераможцамі спаборніцтва ва універсітэце ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР, — дэкана хімічнага факультэта Ф. М. Капуцкага, загадчыка кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў Т. І. Прытыцкай. Начальнік вылічальнага цэнтра А. А. Пальцаў расказаў аб укладзе ВЦ у справу падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Пачуцці студэнтаў у сувязі з узнагародай, вялікую падзяку ад іх імя Цэнтральнаму Камітэту партыі, ураду рэспублікі, Белсаўпрофу выказала студэнтка IV курса філалагічнага факультэта Аня Дашко.

Удзельнікі мітынгу накіравалі прывітальнае пісьмо ў адрас Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа.

**А. АЛЕНІЧ.**

Фота **Д. Прэса.**

## ПЕРАДСВЯТОЧНЫЯ БУДНІ

Асноўны напрамак работы нашай групы ў гэтыя дні — падрыхтоўка да 50-годдзя ўтварэння СССР. Праводзяцца гутаркі, палітінфармацыі, лекцыі аб працоўных дасягненнях, мастацтве, навуцы і культуры саюзных рэспублік.

Не так даўно мы пабывалі ў гарадах Літоўскай ССР—Вільнюсе, Каўнасе. Вялікае ўражанне зрабіў на нас Каўнаскі гістарычны музей. Пераходзячы з залы ў залу, мы паступова знаёміліся з гісторыяй літоўскага народа. Асабліва ўразіла нас зала Вялікай Айчыннай вайны. З хваляваннем сачылі трыццаць вачэй за ўказкай экскурсавода, які расказваў аб вялікіх стратах, аб мужнасці і гераізме літоўцаў у гады выпрабаванняў. І менавіта тут успомніліся родная Беларусь, яе героі, якія побач з літоўцамі мужна абаранялі сваю Радзіму.

Пасля паездкі ў групе адбылася палітінфармацыя, прысвечаная Літоўскай ССР. На яе быў запрошан прадстаўнік гэтай рэспублікі, студэнт факультэта журналістыкі. Ваня Рубін зрабіў агляд літоўскай паэзіі апошніх год, Лена Лабачова расказала аб мастацтве Чурлёніса, аб музеі Чурлёніса, у якім мы пабывалі ў час паездкі.

Нядаўна ў групе створан сектар дружбы. Мэта — больш дэталёвае знаёмства з саюзнымі рэспублікамі. Сектар пачаў перапіску з Каўнаскім політэхнічным інстытутам. Літоўскія сябры расказваюць аб вучобе, аб усім цікавым, што адбываецца ў іх студэнцкім жыцці. Перапіска больш зблізіла студэнтаў дзвюх рэспублік. Зараз сектар вядзе перапіску і з філфакам Ленінградскага універсітэта. На канікулах мы збіраемся наведаць ленінградскіх сяброў.

**В. СТАРЫЧОНАК,**
**старраста III групы II курса беларускага аддзялення.**

## ● У ПАРТКОМЕ

На пасяджэнні парткома абмеркавана пытанне «Аб рабоце кафедр палітэканоміі па выкананню пастановы ЦК КПСС «Аб паляпшэнні эканамічнай адукацыі працоўных». З дакладамі па гэтаму пытанню выступілі загадчыкі кафедр палітэканоміі. Па разгледжанаму пытанню прынята пастанова.

Партком задаволіў просьбу М. К. Гарбачова аб вызваленні яго ад абавязкаў сакратара парткома ў сувязі з работай па завяршэнню доктарскай дысертацыі і падрыхтоўкай яе да абароны.

Сакратаром парткома выбрана Т. Я. Дударава.

## ● НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Адбылося пасяджэнне савета універсітэта. На абмеркаванне быў прадстаўлен даклад старшыні мясцкома В. Ф. Чыгіра аб выкананні плана мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да 50-годдзя ўтварэння СССР, аб выніках сацыялістычнага спаборніцтва.

Задачам універсітэта па далейшаму паляпшэнню завочнай формы навучання прысвяціла сваё выступленне Т. Я. Дударава.

# ЗНАЙСЦІ СЯБЕ Ў НАВУЦЫ

Пленум камітэта камсамола БДУ абмеркаваў навукова-даследчую работу студэнтаў.

У дакладзе сакратар камітэта камсамола А. Слука адзначыў, што 3540 студэнтаў пад кіраўніцтвам савета па НДРС, савета СНТ вядуць вялікую навукова-даследчую работу ў 82 навуковых гуртках, семінарах і лабараторыях. Толькі па гаспадарчых дагаворах у 1971 годзе студэнтамі асвоена 107,5 тысячы рублёў.

Штогод універсітэт прымае ўдзел ва ўсесаюзных конкурсах студэнцкіх работ. Як па колькасці, так і па якасці работ, прадстаўленых на рэспубліканскі конкурс, універсітэт дабіўся лепшых паказчыкаў сярод усіх вну Беларусі.

Многа іншых станоўчых лічбаў і фактаў было прыведзена ў дакладзе.

Але, як адзначалася і ў дакладзе, і ў спрэчках, гэтага далёка не дастаткова, каб можна было лічыць навуковае жыццё студэнтаў сапраўды кіпучым.

Часта здараецца так, што ў пагоні за колькасцю членаў СНТ мы забываем аб якасці.

Многія з выступаючых выказвалі думку, што навуковай работай павінен займацца студэнт, які мае ўжо багаж ведаў, цвёрда выбраў шлях сваёй навуковай дзейнасці.

Знайсці сябе ў навуцы — пытанне нялёгкае. Кожны рашае яго па-свойму. А вось на фізічным факультэце камітэт камсамола разам з супрацоўнікамі кафедр вырашылі дапамагчы студэнтам у гэтым. У сваім выступленні сакратар камітэта камсамола фізфака Т. Працько расказала, што камітэт заключае дагаворы з кафедрамі, па якіх за кожным супрацоўнікам замацоўваецца студэнт, які жадае працаваць на кафедры. Вучоныя і выкладчыкі выступаюць перад студэнтамі з лекцыямі аб напрамках работы кафедр.

На пленуме многа гаварылася аб тым, што члены СНТ не маюць пасведчанняў, не існуе і картачак уліку членаў студэнцкага навуковага таварыства. Толькі ці гэта галоўнае? Выступленне прарэктара па навуковай рабоце прафесара Л. В. Валадзько стала адказам на гэтае пытанне. Як адзначыў Леанід Вікенцьевіч, СНТ — добраахвотнае таварыства, якое павінна дапамагаць студэнтам у арганізацыі даследчай работы. І неабавязкова таму, хто займаецца ёю, быць членам СНТ. Няхай імі будуць толькі самыя дастойныя, якіх, як гэта рабяць на геафаку, можна было б смела рэкамендаваць для паступлення ў аспірантуру.

Камітэтам камсамола, камсамольскім актывістам трэба весці прапаганду НДРС, прыцягваць студэнтаў да тых форм работы, якія ўжо прыжыліся ва універсітэце, — па гаспадарчых дагаворах і ў навуковых гуртках. Трэба паставіць пытанне так, каб не выкладчыкі шукалі студэнтаў, жадаючых займацца навуковай работай, а самі студэнты прыходзілі на кафедры і ў лабараторыі. Трэба памятаць, што за гады вучобы кожны павінен прайсці школу даследчай работы. Дапамагчы гэтаму — задача камсамольскага актыву.

Пленум прыняў пастанову, у якой адзначалася: усямернае развіццё НДРС лічыць неабходнай, састаўной часткай працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў, важнай задачай і прамым абавязкам камсамольскай арганізацыі БДУ. Для гэтага трэба шырэй праводзіць агітацыйна-прапагандысцкую работу сярод студэнтаў.

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

## ЮБІЛЕЙНАЯ НА БІЯФАКУ

Аглядам студэнцкіх сіл называюць на біяфаку навуковыя канферэнцыі. А сілы ў факультэта немалыя. Тут кожны другі студэнт — удзельнік СНТ.

Юбілейная навуковая канферэнцыя, якая нядаўна прайшла на факультэце, была найбольш прадстаўнічай. У рабоце двух яе пасяджэнняў удзельнічала больш як 100 чалавек. Студэнты і выкладчыкі абмяркоўвалі даклады па грамадскіх і спецыяльных дысцыплінах. Лепшымі былі прызнаны работы студэнтаў V курса О. Давыдзенка, Т. Фаменка, Г. Вынаева, Т. Сашанькіна. З вялікім інтарэсам слухалі ўдзельнікі канферэнцыі даклад Г. Вынаева аб асаблівасцях флоры Беларусі. Практычны інтарэс мае таксама работа Т. Сашанькіна. Студэнт праводзіў свае даследаванні непасрэдна на прадпрыемствах.

— Канферэнцыя закончылася, але агляд навуковых сіл працягваецца. Упераадзе — універсітэцкі і рэспубліканскі конкурсы, — сказаў у заключэнне дэкан факультэта Ю. К. Фамічоў.

**А. СЦЯПАНАВА,**
**студэнтка.**

## Камсамольскае жыццё

### ВЕСТКІ З ГІСТФАКА

**Камсамольскі сход, які адбыўся нядаўна на аддзяленні філасофіі, абмеркаваў вынікі вучэбнай і навуковай работы. З дакладам аб рабоце СНТ выступіў лаўрэат Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ І. Шыршоў.**

* * *

**Прайшоў камсамольскі сход студэнтаў І курса, які быў прысвечан пытанням арганізацыі і планавання свайго рабочага дня, падрыхтоўкі да першай сесіі. На сходзе прысутнічалі члены камітэта камсамола факультэта, куратары груп.**

* * *

**Калектыў мастацкай самадзейнасці студэнтаў І курса ў складзе харавой, танцавальнай і вакальнай груп быў створан у пачатку вучэбнага года. І цяпер першакурснікі з вялікім жаданнем і натхненнем рыхтуюцца да выступлення на ўрачыстым юбілейным вечары.**

* * *

**Сяброўства студэнтаў-гісторыкаў з падшэфнай школай Стаўбцоўскага раёна існуе даўно. У гэтым годзе студэнты наладзілі ў школе работу гурткоў: прачытаны лекцыі, рыхтуецца выступленне ансамбля.**

# ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ

Прайшло ўжо больш месяца з таго моманту, калі на гістфаку быў выбран новы камітэт камсамола. Яго састаў абнавіўся амаль на 70 працэнтаў. Што ж зроблена за гэты час? Адразу скажу: зрухі ёсць. Стала больш аператыўнасці і размаху ў рабоце. Пастаянна выпускаюцца насценгазеты на ўсіх курсах, «Камсамольскі пражэктар», факультэцкая газета «Гісторык». Актыўна вядзецца падрыхтоўка да універсітэцкага агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці, працуе агітбрыгада, рэгулярна праводзяцца заняткі з камсамольскім актывам.

Усё гэта добра. Але хацелася б спыніцца на некаторых недахопах у рабоце камітэта.

Даўно патрабавала крытыкі насценгазета «Гісторык»: надта яна ўжо сумная і небаявітая. Канкрэтна некаторыя недахопы «Гісторыка» былі адзначаны ў артыкуле Л. Перасыпкінай «І што гэта за нітачка...» («Беларускі універсітэт» ад 30 лістапада 1972 г.). Заўвагі былі абмеркаваны на пасяджэнні камітэта камсамола. Але, на жаль, нічога не зроблена, каб выправіць становішча. Новы нумар «Гісторыка» выклікае яшчэ больш папрокаў, чым папярэднія. Галоўная прычына, на мой погляд, у перагружанасці членаў рэдкалегіі газеты, напрыклад, такіх, як М. Зыло, Г. Ільяшчук. Яны ўваходзяць у камітэт камсамола, у састаў «КП», выпускаюць курсавую насценгазету і яны ж рэдагуюць насценгазету «Гісторык».

Хацелася б бачыць больш актыўнасці і з боку акадэмічнага сектара камітэта, тым больш, што ўжо зусім блізка зімовая сесія.

**В. КІЕНЯ.**

# ЗАЦІКАВІЦЬ УСІХ

З Наташай Трэгубенка мы пазнаёміліся ў камітэце камсамола юрыдычнага факультэта. Шмат разоў мне давялося сустрэцца з ёю, і заўсёды на мяне рабілі вялікае ўражанне яе працавітасць, энергія і запал, з якімі яна бралася за любую справу. І становіцца часам дзіўна, як гэта яна паспявае спраўляцца з усімі камсамольскімі даручэннямі і пры гэтым яшчэ добра вучыцца.

**— А ці не перашкаджае камсамольская работа у вучобе?**

— Яна сапраўды адбірае ў мяне шмат часу, але ж вучобе не перашкаджае. А калі разабрацца добра, то можна зразумець, што якраз тыя, хто не мае камсамольскіх даручэнняў, і вучацца дрэнна. Чаму? Проста яны думаюць, што часу вольнага хапае, а таму і адкладваюць справы на апошні дзень, а потым не могуць мабілізаваць сябе, пачынаюць адставаць.

**Што трэба рабіць, каб камсамольская работа на факультэце была цікавай?**

— На маю думку, патрэбна прыцягваць да работы як мага больш камсамольцаў, трэба зацікавіць усіх, а то ў нас часта бывае так: аднаго студэнта настолькі завяляць рознымі даручэннямі, што ён не ведае нават, за якое спачатку і брацца, а другі, наадварот, не робіць нічога. А як ні кажы, два чалавекі, як бы яны ні працавалі, зробяць куды больш, чым адзін.

Мне хочацца прывесці ў прыклад І курс, дзе камсоргам Генрых Пятроў. Тут амаль кожны студэнт мае камсамольскае даручэнне, а таму і жыццё на гэтым курсе вельмі цікавае.

**— Ці не лічыш ты, што арганізацыя паспяховай работы на курсах у значнай меры залежыць ад работы камітэта камсамола факультэта?**

— І нават больш, чым у значнай меры, а таму наш камітэт камсамола стараецца як мага больш дапамагаць курсам. Напрыклад, у мінулым годзе на курсах былі куратары з ліку членаў камітэта камсамола: Анатоль Беражанін, Ірына Сяргеева, Анатоль Шчэма і іншыя. Яны дапамагалі курсавому бюро падрыхтоўваць і праводзіць сходы, арганізаваць конкурс на лепшую акадэмічную групу. І вось вынік: паспяховасць павысілася.

Зараз камітэт камсамола дапамагае III курсу, дзе камсамольская работа пастаўлена не вельмі добра...

Інтэрв'ю правяла **Н. НОВІКАВА.**

**На здымку:** намеснік сакратара камітэта камсамола юрфака **Н. Трэгубенка.**

Фота **Д. Чаховіча.**

# У нас у СНТ

Як адзначана ў статуце СНТ універсітэта, асноўнай мэтай студэнцкага навуковага таварыства з'яўляецца ўсебаковае паляпшэнне падрыхтоўкі выпускаемых вну спецыялістаў, дапамога ім у авалоданні прыёмамі і метадамі самастойнага навуковага даследавання.

Як жа пастаўленыя задачы рашаюцца на геаграфічным факультэце? Непасрэдна дзейсным органам СНТ з'яўляюцца студэнцкія навуковыя гурткі пры кожнай кафедры. Кожны з іх аб'ядноўвае 20—30 студэнтаў, членаў СНТ. Але пасяджэнні гурткоў даволі часта праходзяць пры аўдыторыі звыш 50 чалавек. З гэтага прыкладу ўжо відаць, што не ўсіх членаў гуртка варта лічыць членамі СНТ. Пытанне аб членстве ў СНТ заўсёды было прадметам дыскусій і на рэспубліканскіх студэнцкіх навуковых канферэнцыях. Але на кожным факультэце павінны быць членскі білет і нават членская картачка кожнага ўдзельніка СНТ, куды б заносіліся адзнакі аб якасці навуковых даследаванняў, узнагародах і г. д.

На геафаку студэнцкія навуковыя гурткі праводзяць пасяджэнні два разы ў месяц, у адведзены для гэтага на факультэце дзень, які значна разгружан ад заняткаў. Гурткі працуюць у цеснай сувязі з кафедрай і лабараторыямі, імі кіруюць вопытныя выкладчыкі. Агульны напрамак дзейнасці гурткоў вызначае савет СНТ, у які ўваходзяць 5 чалавек (старшыня, яго намеснік, сакратар, рэдактар, адказны за работу гурткоў). Абавязкі кожнага члена строга акрэслены. Савет СНТ вырашыў, што яго старшыня павінен уваходзіць у камітэт камсамола і адказваць за навуковы сектар. Такім чынам будзе падтрымлівацца цесная сувязь «камітэт камсамола — СНТ».

Орган СНТ «Даследчык» выходзіць кожны месяц. У газеце асвятляюцца навуковая дзейнасць гурткоў, асобных студэнтаў, навуковыя сувязі з вну Масквы, Кіева, Вільнюса, Тарту і інш.

Саветам СНТ афармляецца стэнд-вітрына «Студэнцкае навуковае таварыства геафака».

Цяпер на факультэце праводзіцца конкурс на лепшы студэнцкі гурток у гонар 50-годдзя СССР. Пераможцу будзе ўручан пераходны вымпел. Такія конкурсы ў далейшым будуць праводзіцца кожны год.

Сёлета на рэспубліканскі агляд было прадстаўлена 32 навуковыя работы студэнтаў-географаў, 9 з іх атрымалі І катэгорыю, 15—II і 8—III катэгорыю.

Савет СНТ факультэта прызнаў неабходным у канцы гэтага навучальнага года рэкамендаваць у аспірантуру 6 выпускнікоў геафака — актыўных удзельнікаў студэнцкага навуковага таварыства.

**П. ЛОПУХ,**
**старшыня СНТ.**

# ПОШУК НОВЫХ РАШЭННЯЎ

Пры кафедры тэарэтычнай механікі працуюць два навуковыя гурткі для будучых матэматыкаў, а можа, і вядомых праз некалькі год вучоных.

Адным з гурткоў кіруе загадчык кафедры Іван Аляксеевіч Прусаў. Кожны тыдзень збіраюцца студэнты другога і трэцяга курсаў на заняткі, прыходзяць сюды і в'етнамскія студэнты. Гурткоўцы слухаюць даклады, абмяркоўваюць праблемы тэарэтычнай механікі — дынамікі, кінематыкі і статыкі. Вырашаюць узятыя з практыкі цікавыя задачы. Для другакурснікаў гэта знаёмства з новым прадметам. Але тым, хто паспяхова займаецца ў гуртку, будзе дазволена здаць экзамен датэрмінова.

Дацэнт кафедры Міна Мінавіч Чапінага расказаў аб створаным у гэтым годзе навуковым гуртку па механіцы, якім ён кіруе. Займаецца тут каля трыццаці студэнтаў трэцяга курса. На пасяджэннях абмяркоўваюцца даклады па пытаннях, якія вучэбным планам не прадугледжаны. Многа цікавых меркаванняў было выказана пасля даклада «Аб сілах інерцыі», «Аб механічных задачах, паклаўшых пачатак матэматычнай навуцы «Варыяцыйнае вылічэнне».

Тэматыка заняткаў плануецца з улікам жаданняў студэнтаў. І даклады рыхтуюць яны самі. Склалася ўжо так (хоць гурток яшчэ зусім малады), што па адной тэме выступаюць два дакладчыкі. Гэта аблягчае ім падрыхтоўку і кладзе пачатак творчым спрэчкам на пасяджэннях. Студэнты шмат займаюцца самастойна, пашыраюць свой кругагляд. Пошук правільнага рашэння паглыбляе веды.

У гэтым семестры заняткі ўжо скончыліся, а ў наступным будуць разбірацца пытанні па гідрамеханіцы, дынаміцы вадкасці і газаў.

І зноў будуць меркаванні, спрэчкі. І зноў пошук навуковых рашэнняў хвалюючых праблем.

**З. ГАЎРЫШЧУК.**



*Лекцыю «Прадмет функцыянальнага аналізу» для студэнтаў III курса ФПМ чытае кандыдат фізіка-матэматычных навук М. І. ЮРЧУК.*
Фота *Д. ЧАХОВІЧА.*

# КАБ МАГЛІ РАСКАЗАЦЬ МАНЕТЫ...

Валянцін Навумавіч Рабцэвіч схіліўся над сталом. Перад ім у шырокім шкляным посудзе круглыя манеткі. Ён бярэ іх у рукі, уважліва разглядае, нешта запісвае ў сшытак.

— Вывучаю новы скарб, —заўважыўшы мой цікаўны позірк, растлумачвае ён. — Вучоныя гэтыя манеткі называюць кулямі, — і дае мне манетку. Здаецца, патрэш яе, і заблішчыць, як новая.—А ведаеце, які «ўзрост» гэтых манетак? Па меншай меры, дзесяць стагоддзяў....

Разбягаюцца вочы, калі глядзіш на стэнды ўздоўж сцен. Дзіва што — тут сабрана амаль дзесяць тысяч манет. Розных па малюнку, канфігурацыі, памерах. Вось гэтыя маленькія— падобныя на сучасныя аднакапеечныя манеты — з Англіі, побач — авальныя— з Францыі, вышчарбленыя (сляды стагоддзяў) — галандскія і тоненькія, нібы фальга, — з Германіі. Тут ёсць і чаканка старажытнай раздробленай Русі, Ноўгарада, Пскова, Цверы.

Калі з'явіліся на Беларусі грошы часоў Аляксандра Македонскага, Арабскага Халіфата, Залатой Арды? Адказ на гэтае пытанне дае беларуская нумізматыка.

Кожная манета — старонка гісторыі. На іх і назвы гарадоў, і імёны правіцеляў, і бытавыя сцэнкі, і прычоскі, і нават невялікія вершы. Манеты дапамагаюць даведацца аб многіх падзеях мінулага, аб грашовых сістэмах дзяржаў.

Кабінет нумізматыкі (дарэчы, ён пакуль адзіны ў вну краіны) створан пры гістарычным факультэце не так даўно. Загадвае ім дацэнт кафедры старажытнага свету і сярэдніх вякоў В. Н. Рабцэвіч. У кабінеце сабрана многа рэдкіх манет. Так, з чатырох старажытнейшых чэшскіх манет, вядомых цяпер, тры знаходзяцца ў кабінеце беларускай нумізматыкі.

— А вось гэтыя сярэбраныя манеткі, — гаворыць Валянцін Навумавіч, — са скарбу, які быў знойдзен чатыры гады назад у Гараўлянах Віцебскай вобласці. Цікавая гісторыя гэтай знаходкі. Жыхар Гараўлян прыслаў у Акадэмію навук БССР пяць манетак. Тры з іх аказаліся «родам» з Самарканда і Ташкента, дзве— з Германіі. На месца выехала экспедыцыя. Пры раскопках быў знойдзен скарб, які меў каля 300 манет.

У дар кабінету прыносяць свае знаходкі студэнты. На тэрыторыі Беларусі кожны год становяцца вядомымі 10—15 скарбаў, а таксама вялікая колькасць адзіночных манет. Знаходка скарбу — справа выпадку. І гэтая выпадковасць патрабуе строгай рэгістрацыі выдатных помнікаў старажытнасці. Шляхам аналізу манетных знаходак і сведчання пісьмовых крыніц можна вызначыць гандлёвыя, палітычныя і культурныя сувязі Беларусі ў тыя часы.

Пошук і класіфікацыя старажытных манет дапамагаюць вывучыць гісторыю сваёй краіны, выхоўваюць павагу да старажытных помнікаў.

— Многа зараз у нас работы. І, магчыма, — Валянцін Навумавіч ківае ў бок блішчастых круглякоў-манетак на стале, — вось гэты скарб адкрые яшчэ адну старонку ў гісторыі роднай Беларусі, раскажа аб даўно мінуўшых падзеях.

...Напружаная і цікавая праца працягваецца.

**А. КУЛІЦКІ.**

*Лабараторыя антэнна-фідэрных канструкцый. Студэнт-дыпломнік аддзялення радыёфізікі М. Коцік і ст. навуковы супрацоўнік А. В. Ляпёхін даследуюць узор спіральнай антэны.*

Фота *Д. ЧАХОВІЧА.*

**Сёння наш расказ аб самым вялікім факультэце БДУ — фізічным.**

*Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 50-й гадавіны ўтварэння СССР, калектыў фізічнага факультэта здзейсніў значную работу па паляпшэнню палітыка-выхаваўчай, вучэбнай, навуковай работы.*

*Дэканат, партбюро і прафбюро факультэта падвялі вынікі выканання сацыялістычных абавязацельстваў кафедрамі і вызначылі пераможцаў спаборніцтва. Лепшых паказчыкаў дабіліся калектывы кафедр фізікі паўправаднікоў (загадчык прафесар В. Д. Ткачоў), радыёфізікі і электронікі ЗВЧ (загадчык прафесар В. В. Ізох) і вышэйшай матэматыкі (загадчык прафесар Ю. С. Багданаў).*

# ПЛЁН ДАЕ САДРУЖНАСЦЬ

Кафедра фізікі паўправаднікоў адна з маладых на факультэце. Яна была арганізавана ў 1966 годзе. Да 1971 года сем яе супрацоўнікаў абаранілі кандыдацкія дысертацыі. У юбілейным годзе абаронена адна і падрыхтаваны да абароны дзве кандыдацкія дысертацыі.

Разам з выкананнем чатырох дзяржбюджэтных тэм вядзецца вялікая работа па гаспадарча-дагаворных тэмах. Так, у юбілейным годзе калектыў кафедры датэрмінова закончыў адну з навукова-даследчых работ па гаспадарчай тэме на суму 400.000 рублёў.

Многія супрацоўнікі падтрымліваюць цесныя кантакты з прадпрыемствамі электроннай прамысловасці. Сканструяваная на кафедры ўстаноўка для аўтаматычнага запісу рухомасці носьбіта зараду ў паўправаднікох была ўдастоена сярэбранага медаля на ВДНГ СССР. Цяпер некалькі кафедральных даследчых груп, якімі кіруюць кандыдаты фізіка-матэматычных навук В. Ф. Стэльмах, П. Ф. Лугакоў, Р. С. Даманеўскі, В. І. Уранёў, В. П. Дабрэга, займаюцца даследаваннем фізічных уласцівасцей крышталяў паўправаднікоў.

Вялікія клопаты праяўляе калектыў аб павышэнні ўзроўню падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Пачынаючы з III курса студэнты, якія спецыялізуюцца на кафедры, прыцягваюцца да навуковай работы па дзяржбюджэтных тэмах і ўдзельнічаюць у выкананні дагаворных работ. Усе курсавыя работы і большасць дыпломных студэнты выконваюць на кафедры і ў лабараторыях навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем (НДІ ПФП), што забяспечвае іх высокую якасць.

Вядучыя супрацоўнікі рэгулярна сустракаюцца са студэнтамі малодшых курсаў. Лепшыя студэнцкія навукова-даследчыя работы вылучаюцца на рэспубліканскі конкурс. Раней 10 работ атрымалі граматы і дыпломы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Рад студэнтаў прымалі ўдзел ва ўсесаюзных навуковых канферэнцыях у Днепрапятроўску, Вільнюсе, Ерэване і г. д.

Пасля заканчэння універсітэта лепшыя студэнты камісіяй па размеркаванню накіроўваюцца для працы ў лабараторыі ў Інстытут прыкладных фізічных праблем або аспірантуру. Большасць супрацоўнікаў кафедры і сектара фізікі і тэхнікі паўправаднікоў НДІ ПФП — выпускнікі нашай кафедры.

**В. ТКАЧОЎ,**
**загадчык кафедры, доктар фізіка-матэматычных навук.**

# У ЮБІЛЕЙНЫМ ГОДЗЕ

● абаронена 18 кандыдацкіх дысертацый;

● падрыхтаваны і здадзены ў друк 243 артыкулы, 11 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

У выдавецтве «Вышэйшая школа» выйдзе падручнік для універсітэтаў «Механіка» І. І. Пятроўскага.

Выдадзены зборнікі па матэрыялах IV занальнага семінара па методыцы выкладання фізікі ў вну і I сімпозіума «Радыяцыйныя дэфекты ў паўправаднікох»;

● пададзена 11 заявак на вынаходніцтвы;

● распрацавана 5 новых лекцыйных курсаў;

● выканана гаспадарча - дагаворных работ на суму 1 млн. 150 тыс. рублёў.

## СТУДЭНЦКІЯ СПРАВЫ

**На чарговым пасяджэнні намітэта камсамола заслуханы справаздачы аб падрыхтоўцы да святкавання 50-годдзя ўтварэння СССР, аб рабоце інтэрнацыянальнага і шэфскага сектараў.**

**Як паведаміў А. Шары, камсамольская арганізацыя фізфака намеціла правесці ўрачысты вечар студэнтаў у інтэрнаце. Аб'яўлен конкурс паточных і кафедральных насценных газет і фотаконкурс, у групах праводзяцца палітінфармацыі на тэму «Беларусь у брацкай сям'і народаў СССР».**

**В. Мачалаў, адказны за інтэрсектар, інфарміраваў камітэт аб рабоце ў бягучым семестры: праведзен вечар інтэрнацыянальнай дружбы студэнтаў фізфака, якія пражываюць у інтэрнаце, аказана дапамога ў правядзенні такога ж вечара ў Мінскай школе № 27; наладжана перапіска са студэнтамі фізфака, якія навучаюцца ў Чэхаславакіі і ГДР; студэнтам-іншаземцам, якія пакуль дрэнна ведаюць рускую мову, таварышы дапамагаюць рыхтавацца да сесіі.**

**Гаворачы аб недахопах, В. Мачалаў адзначыў слабую сувязь інтэрсектара з камсамольскімі арганізацыямі кафедр.**

* * *

**Адказная за шэфскую работу В. Сямякіна расказала аб тым, што студэнты праводзяць вялікую работу ў школах №№ 1, 18, 33, 41, 56, 71, 74 і іншых г. Мінска, дзе арганізаваны гурткі юных фізікаў, факультатывы і фотагурткі. Шэфы дапамагаюць абсталяваць фізічныя кабінеты, удзельнічаюць у выпуску насценных газет і афармленні стэндаў, праводзяць лекцыі, разам з актывам рыхтуюць камсамольскія сходы.**

**20 студэнтаў-важатых накіраваны ў школу № 56.**

* * *

**Аб'яўлен конкурс на лепшую акадэмічную групу. У ходзе спаборніцтва будуць улічвацца паспяховасць і наведванне ў групах, паспяховасць па грамадскіх дысцыплінах, падтрыманне норм камуністычнай маралі, удзел у СНТ, правядзенне грамадска-палітычнай практыкі ў групах, удзел у грамадскім жыцці, актыўнасць на камсамольскіх сходах, поспехі ў працоўным семестры, мастацкай самадзейнасці, спартыўным жыцці і здачы норм новага комплексу ГПА. Вынікі спаборніцтва будуць падводзіцца па двух этапах: I этап — люты 1973 года, II этап — настрычнік 1973 года. Лепшая група будзе прэміравана.**

* * *

**Вось ужо другі год пры універсітэце працуюць падрыхтоўчыя курсы для моладзі з вытворчасці. Рэгулярна заняткі ў чатырох групах агульнай фізікі гэтых курсаў праводзяць студэнты IV курса фізічнага факультэта Е. Сцяпанава. Ю. Парадзінскі, В. Цуран, Ю. Такарэвіч, О. Ляшко, Е. Крывалапаў. Студэнты III курса Л. Путырская, З. Ластачкіна, В. Волкаў, В. Ранчынскі вядуць заняткі па фізіцы на хімічным аддзяленні падрыхтоўчых курсаў.**

**А. АСТРОЎСКІ.**

# ФАКУЛЬТЭТ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ

Сваім бурным развіццём наш універсітэт і, у прыватнасці, фізічны факультэт абавязаны брацкай дапамозе многіх універсітэтаў нашай краіны і ў першую чаргу Маскоўскаму і Ленінградскаму. Калі мы гаворым «брацкая дапамога», то гэта значыць: абсталяванне лабараторый, выкладчыцкія кадры, падрыхтоўка спецыялістаў праз мэтавую аспірантуру, бескарысная перадача шматгадовага вопыту.

Цяпер наш універсітэт вырас і ўжо сам можа аказваць шматгранную дапамогу іншым вну краіны. Прадстаўнікі многіх рэспублік Савецкага Саюза, а таксама грамадзяне замежных краін праходзяць падрыхтоўку на фізічным факультэце. У нашай інтэрнацыянальнай сям'і цяпер дружна жывуць прадстаўнікі 12 краін.

Вялікая колькасць высокакваліфікаваных спецыялістаў падрыхтавана для В'етнама. Толькі ў гэтым юбілейным годзе дыплом фізіка атрымалі 21 чалавек з ДРВ, 16 з РЮВ. Два аспіранты з ДРВ — Буй Ван Кім і Фан Дзінь К'ен — абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

За апошнія 7 год фізічны факультэт закончыла 106 замежных студэнтаў, 7 іншаземцаў абаранілі кандыдацкія дысертацыі, 6 замежных спецыялістаў павысілі сваю кваліфікацыю. Цяпер на фізфаку праходзіць падрыхтоўку 99 студэнтаў і 12 аспірантаў.

У гэтыя дні замежныя студэнты разам з усім калектывам факультэта рыхтуюцца да сустрэчы вялікага свята — 50-годдзя СССР. Яны позна заседжваюцца ў пакоі дружбы інтэрната і ў аўдыторыях факультэта, рыхтуюцца да выступлення ў калектыве мастацкай самадзейнасці, выпускаюць святочныя насценгазеты. «Ваша свята — наша свята», — гавораць замежныя студэнты.

**Э. ШПІЛЕЎСКІ.**

# ПАЧЫНАЛІ Ў ЛАБАРАТОРЫІ

Лепшым вынікам навуковай дзейнасці студэнтаў з'яўляецца прымяненне іх распрацовак у народнай гаспадарцы. У гэтых адносінах паказальна студэнцкая навуковая лабараторыя кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ. У ёй на практыцы здзяйсняецца прынцып спалучэння навучання з навукова-даследчай работай студэнцкай моладзі. Атрыманыя тут навыкі іграюць важную ролю ў станаўленні маладога спецыяліста-даследчыка.

Мы звярнуліся да кіраўніка лабараторыі старшага навуковага супрацоўніка Уладзіміра **Мікуловіча** з просьбай расказаць аб рабоце лабараторыі і яе супрацоўніках.

— У цяперашні час у лабараторыі працуюць 36 студэнтаў II—V курсаў, у тым ліку група тэарэтыкаў у складзе 6 чалавек пад кіраўніцтвам аспіранта Яўгена Боўбеля. За 1972 год СНДЛ выканае гаспадарча-дагаворных работ на суму 70 тысяч рублёў.

Лабараторыя існуе пяць год. Першыя яе выпускнікі В. І. Антонаў, Л. М. Будзько, А. В. Сяргееў у цяперашні час самастойна працуюць над рашэннем цікавых праблем.

З больш позніх выпускаў варта адзначыць В. І. Вапнярскага, М. Г. Аўсянікава і А. А. Калупаева, якія паспяхова працуюць ва універсітэце.

У нашай лабараторыі дружны калектыў. Шляхі рабят у навуку у многім падобны. Напрыклад, Саша Белы. Яму 24 гады. Ва універсітэт паступіў пасля радыётэхнікума. З III курса працуе ў СНДЛ па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы. На XXIX студэнцкай навуковай канферэнцыі выступіў з дакладам, у якім адлюстраваны асноўныя моманты яго работы. Цяпер працуе над дыпломнай, тэма якой непарыўна звязана з агульным напрамкам лабараторыі. Свае поспехі ў вучобе звязвае з поспехамі навуковай работы.

З малодшага пакалення можна адзначыць Міхаіла Шышкова. У студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі з II курса. Спачатку працаваў са старшакурснікамі В. Вапнярскім і М. Аўсянікавым, цяпер — самастойна. Выступаў з дакладам на студэнцкай навуковай канферэнцыі ў красавіку 1972 года.

З добрымі ведамі і зацікаўленых рабят прыходзіць шмат, але пастаянна захопленых радыётэхнікай не так многа. А хочацца, каб больш рабят магло паспрабаваць свае сілы ў нашай лабараторыі — у пройгрышы ніхто не застанецца.

**Інтэрв'ю ўзяў В. ЛУГОЎСКІ.**



На здымку: студэнты III курса аддзялення радыёфізікі У. Лапатнікаў і В. Філіпенка праводзяць даследаванні ў лабараторыі кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

# НАШ СЯБАР СПОРТ

**Фізфак ва універсітэце здаўна лічыцца адным з самых спартыўных факультэтаў. Ён неаднаразова займаў першае месца ў агульным заліку круглагадавой спартакіяды, з'яўляецца галоўным «пастаўшчыком» спартсменаў у зборныя каманды універсітэта. Напрыклад, мужчынская баскетбольная каманда амаль што цалкам састаіць з фізікаў, каманды па вольнай і класічнай барацьбе, па валейболу (мужчыны), па штанзе, па футболу, лёгкай атлетыцы, гімнастыцы, плаванню састаяць амаль напалову з нашых студэнтаў і супрацоўнікаў.**

**У нас ёсць шмат выдатных спартсменаў. Лёгкаатлеты — майстар спорту А. Якаўлеў, кандыдат у майстры спорту Б. Лютарэвіч, валейбаліст Р. Кароль — члены зборных каманд СССР. Студэнтка III курса Г. Пятрова — чэмпіёнка БССР па баскетболу. Студэнт IV курса Зленка выступае за каманду БССР па настольнаму тэнісу. Студэнты I курса баскетбалісты А. Кандрашоў, В. Тоўсцік выступаюць за юнацкую каманду БССР.**

**Ганарыцца фізфак сваімі штангістамі — майстрам спорту В. Стронгіным, А. Грамыкам, гімнастамі майстрам спорту О. Елеф, Ю. Сакаловым, Н. Леташковай, веласіпедыстам Н. Дзежкуновым, футбалістамі Ромбакам, А. Кліщанкам, барцамі В. Панарадавым, В. Юркевічам, фехтавальшчыкамі А. Швайко, Гафо, гандбалістамі В. Анціміравым і Л. Баравік. І гэта далёка не ўсё, усіх цяжка пералічыць.**

**Многія з нашых лепшых спартсменаў прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта. Напрыклад, студэнт III курса, лепшы стралок фізфака П. Цюрыкаў — грамадскі трэнер-інструктар, капітан зборнай каманды БДУ па баскетболу інжынер кафедры атамнай і малекулярнай фізікі А. Малышаў, які нядаўна выступаў на першынстве ЦС ДСТ «Буравеснік» за каманду БССР, заняўшую там другое месца, чытаў лекцыі ў школе юных фізікаў, неаднаразова выступаў перад вучнямі сваёй роднай школы. Шмат часу аддае арганізацыйна-спартыўнай рабоце і студэнт II курса, барэц, член камсамольскага бюро фізфака М. Прохараў.**

**Нашы спартыўныя традыцыі вядомы ва універсітэце. Таму мне хацелася б звярнуць увагу на тое, што цяжка заўважыць на спартыўных пляцоўках і стадыёнах.**

**Ні для каго не сакрэт, што вучоба на нашым факультэце няпёгкая. Чалавек, сапраўды ўлюбёны ў фізіку, аддае ёй увесь свабодны час. А менавіта такой і з'яўляецца большая частка нашых вядучых спартсменаў. Вось, напрыклад, член зборнай каманды СССР па лёгкай атлетыцы студэнт IV курса кандыдат у майстры спорту СССР Б. Лютарэвіч. Ён не толькі выдатнік, але і прымае актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ. Толькі траўма перашкодзіла яму паехаць гэтым летам разам з другім нашым студэнтам-фізікам, майстрам спорту СССР па дзесяцібор'ю А. Якаўлевым у ЗША на матч юніёраў СССР—ЗША па лёгкай атлетыцы.**

**Але вернемся да той напружанай працы, якая хаваецца за хуткімі секундамі. Сучасны спорт патрабуе многа часу і ўвагі. Каб дабіцца значных вынікаў, трэба трэніравацца 5—6 разоў на тыдзень. Вось і прыходзіцца, каб не адстаць у вучобе, сядзець і вечарамі, і ў нядзелю над кнігамі. Прыходзіцца адмаўляцца ад многага дзеля вучобы і спорту. І, я лічу, не дарэмна. Заняткі спортам прывіваюць дысцыпліну, уменне распараджацца сваім часам, даюць упэўненасць у сваіх сілах, фарміруюць тое, што называецца спартыўным характарам. А ён цудоўны памочнік ва ўсякай справе. Таму не дзіўна, што шмат нашых супрацоўнікаў былі раней і з'яўляюцца цяпер выдатнымі спартсменамі.**

**М. БАТУРЫЦКІ,**
**ст. інжынер кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ.**

Матэрыялы падрыхтаваны карэспандэнцкім пунктам, які ўзначальвае малодшы навуковы супрацоўнік кафедры фізікі цвёрдага цела С. М. Жаўрыд.



# ЁСЦЬ ЧАМУ ПАВУЧЫЦЦА

Многа спраў у загадчыцы шэфскага сектара філфака Тамары Кабан— трэба напомніць дзяўчатам з педатрада: час зрабіць газету, аб'явіць аб выездзе ў падшэфную школу, дамовіцца аб правядзенні лекцый і г. д.

— Другі год шэфствуюць студэнты II курса беларускага аддзялення пад школьнікамі Красненскай сярэдняй школы, — расказвае Тамара.—Усё пачалося з арганізацыі агітбрыгады, адначасова сабралі бібліятэку. Пасля канцэрта падарылі кнігі школьнікам. Так завязалася дружба.

Зусім нядаўна ў Красненскай школе праводзіўся вечар па прафарыентацыі. У гасцях у школьнікаў пабывалі выкладчыкі М. І. Сыракваш, Е. М. Камароўскі, студэнты Людміла Гладкая, Ірына Роўба. Дзяўчаты расказалі, чаму яны выбралі прафесію выкладчыка.

У гэтым годзе студэнтамі III курса сфарміраваны педатрады. Яны вядуць розныя гурткі пры домакіраўніцтвах, маюць свой піянерскі пакой, бібліятэку, ігратэку. Часта выступаюць з канцэртамі. І калі хто-небудзь з гасцей захоча даведацца аб самых цікавых справах піянераў, можа паглядзець захапляючы дзённік, зроблены рукамі рабят.

Пры кінатэатры «Піянер» створан лекторый. Перад дэманстрацыяй кінафільмаў студэнты IV курса чытаюць лекцыі школьнікам. Тэматыка самая разнастайная. Пры гарадскіх школах вядуцца таксама гурткі мовы і літаратуры. На Мінскай фабрыцы «Камунарка» праводзіцца цыкл лекцый, прысвечаных юбілею ўтварэння СССР.

На недалёкае будучае намячаецца правядзенне конкурсу курсавых агітбрыгад. Рыхтуецца вечар дружбы студэнтаў і школьнікаў. Мы запрашаем на яго вучняў падшэфных школ.

З энтузіязмам займаюцца шэфскай работай Валодзя Ламека, Ірына Роўба, Анатолій Шушко, Галя Герка, Мікалай Цялега, Рычард Саматыя. Зусім нядаўна прыйшла да нас на факультэт Люда Гладкая, але ўжо паспела заваяваць аўтарытэт сярод студэнтаў сваёю працавітасцю і ініцыятыўнасцю. Ева Курносенка — камандзір педатрада—арганізавала курсы крою і шыцця пры сваім домакіраўніцтве.

Доўга і цікава расказвала Тамара. Так, у студэнтаў філфака ёсць чаму павучыцца.

**А. МАРТЫНАВА.**

**● БУДНІ СТУДЭНЦКІЯ**

*Лабараторыя кафедры заалогіі беспазваночных. Тут працуюць над сваімі дыпломамі студэнткі V курса біялагічнага факультэта Таццяна Бязнос (на здымку ўверсе), Наталля Лейчанкава (справа) і Тамара Петрыкава.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*



## ШТОДЗЁННЫЯ СУБОТНІКІ

Кожны дзень на новабудоўлі інтэрната політэхнічнага інстытута пануе рабочы настрой і малады запал. Як ні дзіўна, але тут працуюць студэнты матэматычнага факультэта БДУ. Яны дамовіліся з будтрэстам аб магчымасці працаваць на гэтым аб'екце пасля заняткаў.

Вось ужо некалькі тыдняў запар адна студэнцкая група змяняе другую. Зараз на працоўнай вахце трэцякурснікі. Грашовыя сродкі, атрыманыя за кошт штодзённых суботнікаў, будуць выкарыстаны для набыцця музычных інструментаў. Але гэта толькі адзін бок справы. Другі — тое, што цяпер вынікі працы дапамогуць выбраць лепшых для студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

Цікавую ініцыятыву праявілі матэматыкі.

**А. СІВІЦКАЯ.**

## У ГАСЦЯХ У ПАЛІГРАФІСТАЎ

Нядаўна група лектараў факультэта журналістыкі прачытала для навучэнцаў паліграфічнага вучылішча некалькі лекцый, прысвечаных 50-годдзю СССР.

Хутка адбудзецца сумесны вечар паэзіі. Са сваімі вершамі выступяць паэты-журфакаўцы і члены паэтычнага клуба «Ліра», які працуе пры ГПТВ-32 паліграфістаў.

**А. РАДЗЮК.**

# НА СЛУЖБЕ ЗДАРОЎЯ

Што трэба чалавеку, каб не хварэць, пастаянна адчуваць сябе ўладаром свайго арганізма? З такім пытаннем я звярнуўся да загадчыцы паліклінічнага аддзялення нашага універсітэта М. І. Цырульнікавай і ўрача Ф. П. Рэзнікавай.

**Марыя Іосіфаўна Цырульнікава:**

— Аб'ём ведаў зялікі. І санітарная асвета адбірае самае грунтоўнае. Звесткі, якія яна нясе насельніцтву, узяты з тэарэтычнага і практычнага вопыту, правераны жыццём. Студэнтам раю: захоўваць асабістую гігіену, загартоўваць арганізм, не займацца самалячэннем.

Але хто ж не разумее, што лепш зусім не хварэць. А гэта залежыць перш за ўсё ад самога чалавека. Неабходна, каб кожны выхоўваў у сабе навыкі, дабратворныя для арганізма, а не спадзяваўся толькі на навейшыя метады лячэння.

**— Але бывае і так, што чалавек ведае, што ад яго патрабуецца для ўмацавання здароўя, але не робіць гэтага. Чаму так бывае?**

— Па-першае, ад празмернай самаўпэўненасці, па-другое, жывучыя традыцыі і ўяўленні, якія таксама ўплываюць на чалавека, і, нарэшце, недастатковая санітарна-гігіенічная падрыхтоўка.

**— Работа універсітэцкай паліклінікі мае сваю спецыфіку. Раскажыце аб ёй.**

— Спецыфіка перш за ўсё ў тым, што наша праца самым непасрэдным чынам звязана з вучэбным працэсам, заклікана садзейнічаць павышэнню паспяховасці студэнтаў. Урачы, якія замацаваны за факультэтамі, калпоцяцца аб здароўі сваіх студэнтаў, бываюць у інтэрнатах, вучэбных карпусах, падтрымліваюць сувязь з дэканатамі.

**— «Лепш папярэдзіць хваробу, чым яе лячыць» — гэта ісціна вядома ўсім. А папярэдзіць хваробу можна з дапамогай прафілактычнай работы. Раскажыце, калі ласка, аб гэтым.**

— Галоўны від прафілактычнай работы — медыцынскае абследаванне ўсіх студэнтаў. Яно дазваляе выявіць хранічныя захворванні, своечасова ўзяць хворых на дыспансерны нагляд, а для здаровых вызначыць групу фізічнага развіцця. Медыцынскія агляды з'явілася на абследаванне 40 працэнтаў студэнтаў юрыдычнага факультэта. Самымі арганізаванымі аказаліся хімікі.

**— Фаіна Паўлаўна, цяпер Вам пытанне. Важны бок дзейнасці паліклінікі — санітарны кантроль. Хацелася б пачуць аб рабоце ў гэтым напрамку.**

— Урачы кантралююць санітарны стан інтэрнатаў, вучэбных карпусоў, сталовых. Вось адзін з запісаў у дзённіку санітарнага кэнтролю:

«28/XI-72 г. Праверан санітарны стан інтэрната № 7. На першым паверсе брудна, насмечана, уборка не праводзілася, таму што няма прыбіральшчыц, у вёдрах шмат смецця. Асабліва брудна ў пакоях №№ 1301, 1006, 1203.

**— Як Вы лічыце, што трэба для таго, каб санітарны стан быў заўсёды добрым?**

— Самім студэнтам трэба больш сачыць за парадкам у сваіх жа інтарэсах. Санітарны актыў павінен быць сапраўдным актывам. Дзяжурным па факультэтах у перыяд перазменкі неабходна праветрываць аўдыторыі, добра б назначаць дзяжурных і па сталовай. Усебаковую дапамогу павінны аказваць камітэт камсамола, прафком.

**А. СТУКАЛА.**

## «ГПА НА МАРШЫ»

Пад такім дэвізам адбыўся чарговы агітпрабег, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР. Калектыў, у саставе якога ўвайшлі лепшыя спартсмены БДУ, а таксама самадзейныя артысты, пабываў у г. Стоўбцы.

У раённым Доме культуры перад слухачамі выступіў з дакладам старшыня спартыўнага клуба У. Цітарук. Ён расказаў, як праходзіць па ўсёй краіне і, у прыватнасці, у Беларусі здача норм ГПА.

Потым заслужаны трэнер БССР, экс-чэмпіён свету па кіданні молата М. Крываносаў расказаў аб Алімпійскіх гульнях у Мюнхене.

Бурнымі апладысментамі былі сустрэты паказальныя выступленні па боксу, самба, мастацкай і спартыўнай гімнастыцы і іншых відах спорту пад кіраўніцтвам выкладчыка спорткафедры БДУ М. А. Шэйнемана.

Закончылася сустрэча канцэртам мастацкай самадзейнасці з удзелам вакальна-інструментальнага ансамбля і студэнтаў юрыдычнага, фізічнага і іншых факультэтаў БДУ.

**Г. ШПАКОВА.**

# КАЛІ ВЫ ПАРУШЫЛІ ПРАВІЛЫ...

*Студэнт матфака М. Белікаў звярнуўся у наш нештатны аддзел «За бяспеку руху» з пытаннем: «Раскажыце, калі ласка, якія штрафы накладваюцца на пешаходаў за парушэнне правіл руху і ад чаго залежаць іх размеры?»*

*На пытанне нашага чытача адказвае супрацоўнік Мінскай дзяржаўтаінспекцыі Р. АЎРАМЕНКА:*

— Прымяняючы да пешахода-парушальніка меру адміністрацыйнага ўздзеяння — штраф, мы клапоцімся перш за ўсё не аб пакаранні, а аб выхаванні пешахода як удзельніка руху. Вельмі важна, каб парушальнік усвядоміў свой учынак, зразумеў яго магчымыя вынікі.

Таму, перш чым адказаць на пытанне, я б хацеў спыніцца на характарыстыцы найбольш распаўсюджаных парушэнняў, якія дапускаюць пешаходы. Перш за ўсё, гэта — нечаканае з'яўленне на праезджай частцы перад праходзячым транспартам.

Можа ўзнікнуць пытанне: што трэба разумець пад словамі «нечаканае з'яўленне»? Дзе той крытэрый, па якому можна меркаваць аб гэтым?

Нечаканым лічыцца раптоўны выхад пешахода на тую частку вуліцы, дзе пешаходны рух забаронен, але часам нечаканым для вадзіцеля можа аказацца з'яўленне чалавека нават на пешаходным пераходзе. Тут маецца на ўвазе той момант, калі для пешахода гарыць чырвоны сігнал светафора, які забараняе рух праз вуліцу.

Усе гэтыя дзеянні прыводзяць нярэдка да сумных вынікаў. Не сакрэт, што многія і ў многіх выпадках схільны абвінавачваць вадзіцеляў: «носяцца з шалёнай скорасцю». Часта гэтыя папрокі бываюць беспадстаўнымі: вінаватым аказваецца сам пешаход. З прычыны нечаканасці з'яўлення на праезджай частцы вуліцы пешаход «адабраў» у вадзіцеля тыя метры і секунды, якія яму былі неабходны для спынення машыны. У выніку — або сам пешаход расплачваецца за сваю неасцярожнасць, або па яго віне церпяць іншыя людзі.

Вось чаму і штраф на пешахода накладваецца ў некаторых выпадках не проста за парушэнне правіл руху, а за стварэнне аварыйных абставін на вуліцы. У прамой залежнасці ад гэтага знаходзяцца і размеры штрафу. Калі, скажам, парушальнік не стварае відавочнай небяспекі для руху штраф на ўгледжанне інспектара дарожнага нагляду можа быць накладзен на месцы ў суме 50 капеек. Але калі пешаход сваімі паводзінамі на вуліцы стварае аварыйныя абставіны для праходзячага транспарту, на яго накладваецца штраф да 3 рублёў (дзяржаўтаінспектар можа штрафаваць на 10 рублёў), для чаго складаецца пратакол парушэння і накіроўваецца ў Дзяржаўтаінспекцыю.

Калі да ўстаноўленага тэрміну парушальнік не заплаціў штраф, пратакол з пастановай аб накладанні штрафу накіроўваецца па месцу работы або вучобы парушальніка, дзе з заработнай платы або стыпендыі ўтрымліваецца ўказаная сума.

Рэдактар
**А. А. НІКОЛЕНКА.**

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2.000 экз. АТ 03452 Заказ 1534.